# ПАДРЫХТОЎКА ПАЧАЛАСЯ

Шырока разгарнулася ва універсітэце падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Савет Беларускай ССР і ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных, якія назначаны на нядзелю, 13 чэрвеня 1971 года. У парткоме зацверджан план арганізацыйнай і агітацыйна-прапагандысцкай работы. Праведзена нарада з сакратарамі партыйных арганізацый па пытаннях падрыхтоўкі да выбараў. Вызначана ўзначальваючая партыйная арганізацыя — гістарычнага факультэта.

У састаў агітацыйнага калектыву выдзяляюць па дзесяць лепшых агітатараў факультэты журналістыкі, прыкладной матэматыкі, а таксама філалагічны, гістарычны, матэматычны, хімічны факультэты.

На днях зацверджаны загадчык агітпункта, кіраўнік агіткалектыву і ўчастковая выбарчая камісія. Згодна з планам у агітпункце з 1 красавіка будуць арганізаваны лекцыі, гутаркі, кансультацыі па пытаннях савецкай выбарчай сістэмы, у кіназале геаграфічнага корпуса плануецца дэманстрацыя мастацкіх і дакументальных фільмаў.

**У. АРЛОЎ.**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (806) ● Чацвер, 25 сакавіка 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

*НАСУСТРАЧ XXIV З'ЕЗДУ КПСС*

## КАФЕДРА—З'ЕЗДУ

Прымаючы абавязацельствы ў гонар XXIV з'езда КПСС, калектыў кафедры фізікі цвёрдага цела шукаў новыя формы палітыка-выхаваўчай работы і шляхі інтэнсіфікацыі навуковых даследаванняў. Таму калі сакратар партыйнага бюро фізічнага факультэта, старшы выкладчык нашай кафедры С. А. Кіслякоў прапанаваў арганізаваць у горадзе Дзяржынску школу юных фізікаў і весці заняткі ў ёй у асноўным сіламі выкладчыкаў, аспірантаў і навуковых супрацоўнікаў кафедры, усе з адабрэннем падтрымалі гэтую ініцыятыву. З вялікай энергіяй узяліся за арганізацыю школы юных фізікаў С. А. Кіслякоў і старшы выкладчык Э. В. Ратнікаў. І вось пачынаючы з 22 лістапада 1970 г. два разы ў месяц, па нядзелях, у школе № 1 г. Дзяржынска праходзяць заняткі з групай у 20—30 вучняў школ Дзяржынскага раёна.

Згадзіліся працаваць у школе некаторыя выкладчыкі іншых кафедр факультэта. Дзякуючы гэтаму заняткі праходзяць на высокім узроўні і выклікаюць зацікаўленасць у рабят.

Мы ўпэўнены, што многіх выпускнікоў Дзяржынскай школы юных фізікаў сустрэнем у ліку будучых студэнтаў фізфака.

Плануючы павышэнне эфектыўнасці навуковай працы, мы не выпускалі з-пад увагі, што яна ў немалой ступені залежыць ад наяўнасці спецыяльнай апаратуры. Бо здараюцца выпадкі, калі неабходныя ўстаноўкі не выпускаюцца прамысловасцю і павінны быць зроблены сіламі навуковых работнікаў.

У абавязацельствах кафедры якраз ёсць пункты, у якіх гаворыцца аб тым, што супрацоўнікі навуковай групы абавязваюцца паскорыць падрыхтоўку і пуск некаторага ўнікальнага абсталявання: паскаральніка для іённа-апраменьваючага легіравання, магнітнага аналізатара электронаў і інш. Актыўна ўключыўся ў выкананне гэтых абавязацельстваў старшы інжынер І. М. Белы. У кароткі тэрмін ён распрацаваў неабходныя чарцяжы іённай устаноўкі і забяспечыў хуткую яе падрыхтоўку і зборку. Да адкрыцця з'езда ўстаноўка ўвойдзе ў лік дзейнічаючых.

Агульны ўздым інтэнсіўнасці навуковай працы на кафедры праявіўся і ў павелічэнні, у параўнанні з абавязацельствамі, колькасці навуковых артыкулаў, падрыхтаваных да публікацыі: 15 замест 12, а таксама дакладаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры.

**Г. ГУМАНСКІ,**
**загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, дацэнт.**



*НА ЗДЫМКУ справа: заняткі па картаграфіі ў студэнтаў II курса геафака, якія вядзе асістэнт кафедры геадэзіі і картаграфіі Л. Д. Мельнікава.*

*● Прайшоў першы ў сёлетнім семестры дзень завочніка.*

*НА ЗДЫМКУ унізе: экзамен па нямецкай мове здае студэнтка III курса юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта В. П. СІДАРАВА. Старшы выкладчык Г. Я. ДУНАЕЎСКАЯ (справа) на выдатна ацаніла веды студэнткі.*

*Фота Д. Чаховіча.*



## ПА-ФРАНЦУЗСКУ АБ ГЕРОЯХ КАМУНЫ

Споўнілася 100 год з таго дня, калі рабочы клас падняў чырвоны сцяг Парыжскай Камуны. Усё прагрэсіўнае чалавецтва ўрачыста адзначыла гэтую гістарычную дату.

У актавай зале БДУ адбыўся вечар, арганізаваны калектывам кафедры французскай мовы. Сярод гасцей было многа замежных студэнтаў, якія вучацца ў ВНУ Мінска і ў нашым універсітэце.

Даклад аб 100-годдзі Парыжскай Камуны зрабіла выкладчыца кафедры новай і навейшай гісторыі Б. С. Мацвіенка. Аб героях Парыжскай Камуны на французскай мове расказалі студэнты гістарычнага факультэта Г. Лазько, Г. Дайчык.

Шырокай і разнастайнай была праграма студэнцкай самадзейнасці. Гледачы цёпла сустрэлі выканаўцаў вершаў і апавяданняў французскіх паэтаў і пісьменнікаў Віктара Гюго, Эжэна Пацье, Луізы Мішэль, песні французскіх кампазітараў. Актыўны ўдзел ў канцэрце прымалі студэнты гістарычнага, фізічнага і біялагічнага факультэтаў.

Вечар прайшоў з вялікім поспехам.

**А. ЖУК,**
**М. ЧУДАЕЎ,**
**супрацоўнікі БДУ.**




## ЗА СВОЙ РАДОК У НАВУЦЫ

**Імкліва бяжыць час. З пункту гледжання чалавечага жыцця зусім нядаўна — усяго 50 год назад — упершыню адкрыліся дзверы створанага па ленінскаму дэкрэту Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тады аудыторыі запоўнілі прыйшоўшыя з франтоў грамадзянскай вайны чырвонаармейцы, дзеці рабочых і сялян. У многім яны былі не падобны да сённяшніх студэнтаў, у галоўным жа—такія ж дасціпныя, няўрымслівыя, прагнучыя ведаў.**

**І усё ж час бярэ сваё. Далёка зрабіў крок наперад сённяшні студэнт. Ён імкнецца ужо ў сценах універсітэта як мага паўней праявіць свае здольнасці і схільнасці. Нават у навуковых даследаваннях прыкметны гэты імклівы рост моладзі. Цяпер і для студэнтаў актуальным становіцца лозунг «За свой радок у навуцы». Яскравым прыкладам гэтага можа слу-**

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# АЛГАРЫТМ ЖЫЦЦЯЛЮБСТВА



**Нядаўна спартыўны клуб Маскоўскага ордэна Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя М. В. Ламаносава адзначыў сваё 25-годдзе. Напярэдадні юбілею карэспандэнт газеты «Советский спорт» Н. Нікіцін сустрэўся з Героем Сацыялістычнай Працы, членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, рэктарам МДУ І. Г. Пятроўскім і папрасіў яго расказаць, якое месца займаюць фізічная культура і спорт у жыцці шматтысячнага калектыву універсітэта.**

**Адказваючы карэспандэнту газеты, І. Г. Пятроўскі вялікую ўвагу ўдзяліў гарманічнаму развіццю чалавека, таму, як фізкультура і спорт становяцца добрымі памочнікамі вучоных, выкладчыкаў і студэнтаў у іх паўсядзённай вучобе і працы.**

**Тое, што расказаў І. Г. Пятроўскі, несумненна, будзе цікава і для нашых чытачоў. Артыкул даецца з нязначнымі скарачэннямі.**

Цяпер медыкі шмат гавораць аб гіпадынаміі. Сапраўды, малярухомы спосаб жыцця, калі сродкі цывілізацыі дазволілі гарадскому жыхару скараціць да мінімуму фізічныя нагрузкі, рухі, прыводзіць да таго, што арганізм чалавека стаў губляць свае ахоўныя ўласцівасці да захворванняў, старэе раней часу.

Вось чаму мы імкнемся, каб студэнты ў разумных межах сумяшчалі вучобу з заняткамі фізічнай культурай і спортам. Бо многія з іх прыйдуць у навуку, дзе патрэбна не толькі светлая галава, але і моцнае здароўе. Здараецца, што вучоны суткі, месяцы, гады праводзіць у лабараторыі, бібліятэцы, за пісьмовым сталом. І каб прадоўжыць творчае даўгалецце, трэба сябраваць з прыродай, выкройваць час для турысцкіх паходаў, лыжных прагулак, нарэшце, для спорту. Вялікі рускі вучоны Міхайла Ламаносаў, імем якога названа наша ВНУ, пяшком прыйшоў у Маскву з далёкага архангельскага сяла. Гэта быў шыракаплечы 19-гадовы сілач, які з дзесяці год хадзіў у мора і быў дублёны самымі злымі паўночнымі вятрамі. Ён пражыў нядоўгае жыццё — памёр, калі яму не было яшчэ 54 год. Але за гады, якія ён аддаў навуцы, Ламаносаў зрабіў столькі, на што іншаму не хапіла б і двух жыццяў.

Успомніце выдатнейшага рускага фізіёлага — акадэміка Івана Пятровіча Паўлава. У 65 год ён навучыўся ездзіць на веласіпедзе, цудоўна плаваў, займаўся гімнастыкай. А з якім азартам ён іграў у гарадкі! Здаралася, вечарам, пры ліхтарах, выходзіў ён на гарадошную пляцоўку. Буйнейшы вучоны, ён, як ніхто іншы, ведаў цану фізічным практыкаванням.

Гісторыя Маскоўскага універсітэта ведае нямала прыкладаў, калі вялікія вучоныя, гіганцкія розумы пры ўсёй сваёй занятасці знаходзілі час для заняткаў фізічнай культурай і спортам.

Выдатны рускі фізік, прафесар Маскоўскага універсітэта П. Н. Лебедзеў быў не толькі вялікім вучоным, але і цудоўным спартсменам. Ён займаўся акадэмічнай грэбляй, шмат падарожнічаў і захапляўся альпінізмам. Здзіўляюча, што чалавек, надзвычай загружаны, здавалася б, ад усяго адхілены, усё ж знаходзіў час для здаровага адпачынку. Многім сваім вучням прафесар прывіваў любоў да фізічных заняткаў, аб чым з удзячнасцю ўспамінаў пазней прэзідэнт Акадэміі навук СССР С. І. Вавілаў.

Пра сусветна вядомага матэматыка прафесара універсітэта Андрэя Мікалаевіча Калмагорава за мяжой ходзяць легенды. Адзін амерыканскі матэматык неяк прызнаўся, што ў ЗША думалі: пад імем Калмагорава працуе цэлая група вучоных. І памылку амерыканцаў няцяжка зразумець, калі ўспомніць вялізную колькасць фундаментальных прац Калмагорава па розных прадметах, пачынаючы з работы па гісторыі ноўгарадскага землеўпарадкавання, тэорыі імавернасцей, асноў вершаскладання і канчаючы праблемамі ўтварэння цяперашніх форм мацерыкоў.

Так, Андрэй Мікалаевіч з'яўляецца буйнейшым матэматыкам сучаснасці. Акадэмік, лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы, першы ў гісторыі лаўрэат міжнароднай матэматычнай прэміі Бальцано — гэтай «нобелеўскай» прэміі матэматыкаў, член многіх акадэмій свету... І, уявіце, гэты вучоны — адданы прыхільнік фізічнай культуры. Вось ужо сорак год ён прапагандуе актыўны адпачынак. Сваіх вучняў прафесар займае не толькі матэматыкай, але і ў поўным сэнсе гэтага слова патрабуе ад іх выдатнага здароўя, веры ў свае сілы, настойлівасці ў дасягненні пастаўленай мэты. А гэтыя рысы выхоўваюцца ў спорце.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*




# ЗА СВОЙ

*У розныя гады ў нашым універсітэце філасофскія навукі выкладалі буйныя вучоныя Савецкага Саюза. Некаторыя з іх, як, напрыклад, В. Ф. Асмус, прыязджалі сюды часова. Іншыя (член-карэспандэнт АН СССР М. Т. Іаўчук, акадэмік АН СССР Г. Ф. Аляксандраў) працавалі на працягу некалькіх год, вялі тут навуковыя даследаванні. Матэрыялы пра іх студэнты таксама ўключылі ў сваю кнігу.*

# УЗРОВЕНЬ СУЧАСНАСЦІ

*Член-карэспандэнт АН БССР прафесар І. М. ЛУШЧЫЦКІ. (З уводзін да кнігі «Філасофскія навукі БДУ за 50 год»).*

**Для мяне вялікае задавальненне прадставіць чытачу гэтую працу, якая з'яўляецца вынікам трохгадовых пошукаў і напружанай работы членаў навукова-даследчага студэнцкага гуртка гісторыі філасофіі. Яна сведчыць аб многім такім, што не можа не прынесці радасць, не выклікаць гордасць. Пачаць хоць бы з таго, што кнігу падрыхтавалі і напісалі студэнты. Ім, гэтым маладым людзям, каб узяцца за такую сур'ёзную і адказную справу, патрэбна была не толькі смеласць. У падобнай справе не менш, а, бадай, больш важным, неабходным былі высокі агульнаадукацыйны ўзровень і, без перабольшання можна сказаць, пэўная духоўная, палітычная спеласць.**

**Мы, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, часта і не без падставы наракаем на тое, што нашы школы яшчэ дапускаюць промахі ў вучэбнай і выхаваўчай рабоце, што ўчарашнія школьнікі, стаўшыя студэнтамі, часам выяўляюць прабелы ў ведах. І, разам з тым, мы заўважаем, што з кожным годам савецкая школа прагрэсіруе, у вышэйшыя навучальныя ўстановы прыходзіць усё больш падрыхтаванае папаўненне. Адным са шматлікіх доказаў гэтага можа служыць даная кніга. На самай справе, у 1968 годзе, калі ў навукова-даследчым гуртку, створаным пры нашай кафедры, наспела рашэнне ўзяцца за складанне бія-бібліяграфічнага слоўніка «Філасофскія навукі БДУ за 50 год», членамі яго былі студэнты першага і другога курсаў філасофскага аддзялення гістфака, г. зн. учарашнія школьнікі.**

**Гэта даволі прыкметная з'ява. Аднак яна сведчыць не толькі аб сур'ёзных зрухах да лепшага ў рабоце педагагічных калектываў школ, школьнай камсамоліі, стварэнні больш спрыяльных умоў для вучобы падрастаючага пакалення, але і аб павышэнні пачуцця адказнасці моладзі перад грамадствам, імкненні і ў час вучобы прыносіць яму як мага больш карысці. Гэтыя прыемныя перамены закранулі і такую галіну студэнцкага жыцця, як навуковыя даследаванні.**

**Гутарка ідзе не толькі аб студэнцкіх гуртках прыродазнаўчага профілю — хімічных, фізічных, біялагічных і інш., — якія, напрыклад, у нашым універсітэце вядуць шырокія даследаванні ў цеснай сувязі з практычнымі патрэбамі народнай гаспадаркі. Студэнты — філосафы, гісторыкі, юрысты, эканамісты, прадстаўнікі іншых гуманітарных факультэтаў цягнуцца да такіх даследаванняў, якія мелі б практычны выхад, не загінулі б бясследна. Ці не аб гэтым гавораць рэспубліканскія і ўсесаюзныя конкурсы студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі камсамола і міжнароднага маладзёжнага руху! У прадстаўляемых на іх працах усё большае месца займаюць актуальныя, малавывучаныя тэарэтычныя і практычныя праблемы.**

**Канешне, ва ўсіх гэтых пераменах у студэнцкім жыцці важная роля належыць старэйшым таварышам. І поўнасцю маюць рацыю студэнты філасофскага аддзялення БДУ — аўтары рэкамендуемай чытачу кнігі, калі гавораць, што без дапамогі, падтрымкі сваіх выкладчыкаў, якім яны шчыра дзякуюць, якім прысвячаюць сваю першую навуковую працу, яны б не справіліся з такой работай. У гэтых словах выказана не толькі даніна ўсталяванай у нашай краіне традыцыі, па якой савецкія вучні з павагай адносяцца да сваіх настаўнікаў, выхавацеляў, але і, несумненна, узросшы ўзровень кіраўніцтва навукова-даследчай работай студэнтаў. Філасофскія і іншыя кафедры нашага універсітэта прыцягваюць да кіраўніцтва навукова-даследчымі гурткамі лепшых выкладчыкаў, энергічных вучоных, здольных асабістым прыкладам захапіць моладзь.**

**Нарэшце, паяўленне гэтай кнігі знамянальнае і ў такіх адносінах. Буржуазная прапаганда няспынна сцвярджае, што ў Савецкім Саюзе існуе і абвастраецца праблема бацькоў і дзяцей, што нібы няма міру паміж пакаленнямі і пры сацыялізме. Кніга нашых студэнтаў — яшчэ адно абвяржэнне гэтага надуманага вываду, сведчанне і глыбокай зацікаўленасці савецкай моладзі да спраў сваіх бацькоў, і імкненне чэрпаць з вопыту старэйшых, ісці з іх дапамогай далей.**

**А цяпер аб змесце кнігі. Бія-бібліяграфічны слоўнік, падрыхтаваны студэнтамі, мае не толькі пазнавальнае значэнне, хоць апошняе само па сабе вельмі важна. Упершыню разам сабраны асноўныя звесткі аб жыцці і навуковай дзейнасці амаль усіх выкладчыкаў філасофскіх дысцыплін, якія працавалі і працуюць у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Трэба сказаць, што гэта нялёгка было зрабіць. Думаецца, студэнты паступілі правільна, уключыўшы ў слоўнік матэрыялы аб В. Г. Кнорыне, М. М. Шчэкаціхіне, М. Р. Сыркіне і іншых вучоных, якія, працуючы ў іншых галінах навукі, так ці інакш садзейнічалі развіццю філасофскіх даследаванняў і філасофскай адукацыі ва універсітэце. Упершыню таксама складзена такая шырокая бібліяграфія кніг, брашур і артыкулаў па філасофскіх праблемах. Вось чаму слоўнік можа і павінен стаць добрым дапаможнікам у рабоце даследчыкаў гісторыі навукі, грамадскай думкі ў Беларусі.**

**Аўтары не ставілі перад сабой задачу падрабязна характарызаваць навуковую дзейнасць выкладчыкаў і, тым больш рабіць аналіз іх важнейшых прац, але нават у такім выглядзе сабраны студэнтамі матэрыял уяўляе вялікі інтарэс. У ім адлюстравана гісторыя зараджэння і развіцця філасофскіх даследаванняў у БДУ за цэлае пяцідзесяцігоддзе.**

**Наогул вялікую справу зрабілі студэнты-філосафы. Хочацца ад шчырага сэрца павіншаваць іх з гэтым першым у іх жыцці навуковым подзвігам.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**жыцць дзейнасць студэнцкага гуртка па гісторыі філасофіі, якім кіруе дацэнт М. І. Іоська. Днямі членамі гуртка закончана падрыхтоўка рукапісу кнігі «Філасофскія навукі БДУ за 50 год». Гэта бія-бібліяграфічны слоўнік, які ўключае ў сябе звесткі аб жыцці і навуковай дзейнасці каля 80 выкладчыкаў філасофскіх дысцыплін БДУ перыяду 1921—1971 гадоў. Аб'ём гэтай студэнцкай працы — звыш 200 машынапісных старонак, або, гаворачы выдавецкай мовай, 10 друкаваных аркушаў.**

**Тры гады члены гуртка — студэнты філасофскага аддзялення гістфака ў архівах збіралі матэрыял, вывучалі, апрацоўвалі, абагульнялі яго. Затым упершыню селі за напісанне кнігі. Для іх усё было ўпершыню. Зрэшты, для моладзі гэта не ў навіну—ёй шмат дзе даводзіцца быць першай.**

**Сёння мы знаёмім чытачоў газеты з некаторымі вынікамі студэнцкіх даследаванняў, прысвечаных 50-годдзю універсітэта. Пры гэтым прадстаўляем аўтараў новай кнігі: студэнты філасофскага аддзялення А. Злотнікаў (староста гуртка), В. Пятроўскі, Г. Грушавы, Р. Іваноўскі, І. Салаўёва, І. Бычынскі, П. Касцюкевіч, І. Сіняўская, М. Грэцкая, Т. Ламека, С. Малажанава, Д. Ротман, Л. Беразная, Н. Максімава, Р. Зеляніцкая, П. Савасцёнак.**

# З УДЗЯЧНАСЦЮ ВЫКЛАДЧЫКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**(З уступнага слова студэнтаў да сваёй кнігі)**

Мы вырашылі напісаць гэтую кнігу, па-першае, таму, што хацелі займацца такой навукова-даследчай работай, якая не толькі ўзбагаціла б нас ведамі, вопытам даследаванняў, працы ў архівах, але і не прапала б бясследна. Па-другое, неабходнасць такога выдання даўно наспела. А, па-трэцяе, юбілярам прынята падносіць памятныя падарункі. Такім падарункам роднаму універсітэту ў дзень яго пяцідзесяцігоддзя ад студэнтаў-філосафаў і будзе гэта наша сціплая праца.

Задача, якую мы паставілі перад сабой, аказалася нялёгкай. І калі мы з ёю ў нейкай меры справіліся, то гэта стала магчымым дзякуючы дапамозе і падтрымцы сваіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў архіваў і бібліятэк Мінска, Масквы, Кіева, Казані, Ташкента і іншых гарадоў, родных і блізкіх тых выкладчыкаў філасофскіх дысцыплін у БДУ, якіх ужо няма ў жывых. Больш года забрала ў нас складанне і удакладненне слоўніка, яшчэ два гады пайшло на збор, вывучэнне і апрацоўку матэрыялаў. Не ўсе вытрымалі гэтую нагрузку: з 32 членаў гуртка ў састаў аўтарскага калектыву ўвайшло толькі 16.

Мы добра ўсведамляем, што выкананая намі праца — толькі маленькая часцінка той работы, якую неабходна зрабіць даследчыкам па выяўленню, вывучэнню і абагульненню дакументальнага і літаратурнага матэрыялу, характарызуючага ўклад вучоных універсітэта ў развіццё філасофскіх навук і філасофскай адукацыі ў рэспубліцы і ў краіне.

Аб некаторых выкладчыках мы не змаглі сабраць неабходных звестак, у іншых — няпоўныя спісы друкаваных прац. У цэлым бібліяграфію, складзеную намі, трэба лічыць выбранай. Часам мы сумысля не ўключалі асобныя артыкулы, брашуры і кнігі, калі яны не падыходзілі пад філасофскую тэматыку. Як правіла, апускаліся газетныя артыкулы. У сувязі з вялікай розніцай у аб'ёме сабранага для біяграфічных нарысаў матэрыялу частка яго не магла быць выкарыстана. Вось чаму мы стварылі на кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ рукапісны архіў, куды перадалі ўсе сабраныя намі дакументы.

Як прынята ў такога роду выданнях, біяграфіі выкладчыкаў размешчаны ў алфавітным парадку. Скласці ж агульнае ўяўленне, прасачыць логіку развіцця філасофскіх навук у БДУ дапаможа уступны артыкул аднаго з ветэранаў філасофскага фронту універсітэта загадчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесара І. М. Лушчыцкага.

Аўтары дзякуюць за дапамогу і садзейнічанне ў рабоце ўсім членам кафедр гісторыі філасофіі і логікі і марксісцка-ленінскай філасофіі, лабарантам кабінета гісторыі філасофіі Г. Рудзеню і Г. Кандраценка, прарэктару па навуковай рабоце члену-карэспандэнту АН БССР прафесару Л. В. Валадзько, прарэктару па навуковай рабоце члену-карэспандэнту Акадэміі педагагічных навук СССР С. А. Умрэйку, начальніку аддзела кадраў БДУ І. Ф. Кастрову, супрацоўнікам ЦДАКР СССР, Партархіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, ЦДАКР БССР, архіваў БДУ, радыётэхнічнага і політэхнічнага інстытутаў, Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, старшаму рэдактару БелСЭ М. І. Камінскаму. Мы выказваем удзячнасць прафесару Маскоўскага інстытута народнай гаспадаркі Б. Э. Быхоўскаму, старшаму навуковаму супрацоўніку кафедры генетыкі МДУ Я. У. Іваноўскай і дацэнту кафедры фізічнай хіміі Маскоўскага тэхналагічнага інстытута Т. У. Іваноўскай, Ф. Р. Выдра, Я. Я. Вальфсон, М. С. Кацэнбогену, якія падзяліліся з намі матэрыяламі з асабістых архіваў.

Сваю кнігу мы прысвячаем 50-годдзю БДУ і ўсім выкладчыкам універсітэта.

# І ЗВЯЗАЎ СВОЙ ЛЁС З БЕЛАРУССЮ

**ІВАНОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч (1867—1939) нарадзіўся ў сям'і настаўніка грэчаскай мовы ў горадзе Вышні Валачок Цверскай губерні. У адзінаццаць год застаўся без бацькоў і разам з малодшымі братам і сястрой некаторы час выхоўваўся ў дзеда, затым сам стаў зарабляць на пражытак. Вучыўся ў 1-й Маскоўскай гімназіі, а ў 1890 годзе выдатна закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Работы аднак не атрымаў (яму прыпомнілі ўдзел у студэнцкіх хваляваннях) і вымушан быў даваць прыватныя ўрокі, здабываць сродкі для існавання перапіскай папер ва ўстановах.**

**Пасля падрыхтоўкі экстэрнам і здачы магістарскіх экзаменаў па філасофіі таксама не давялося ўладкавацца на работу ў вышэйшую навучальную ўстанову. Сябры дапамаглі адшукаць заработак у розных навуковых аб'яднаннях, а затым і месца сакратара рэдакцыі часопіса «Вопросы философии и психологии». З 1892 года У. М. Іваноўскі стаў выступаць у друку па праблемах філасофіі і іншых навук...**

**У 1900 годзе У. М. Іваноўскі атрымлівае навуковую камандзіроўку за мяжу. У Берліне ён быў залічан студэнтам універсітэта і праслухаў курс лекцый Паульсена, Дыльтэя, Штумпфа, Зіммеля, удзельнічаў у практычных занятках па эксперыментальнай псіхалогіі. Навучальны 1900—1901 год правёў у Парыжы, дзе ў Сарбоне наведваў лекцыі Бергсана, Брошара, Рыбо, Бутру, сам выступаў з дакладамі на семінарах па гісторыі філасофіі. У ліпені 1900 года ў Парыжы прыняў удзел у рабоце І Міжнароднага філасофскага кангрэсу, зрабіў даклад па філасофскай тэрміналогіі і быў выбран у бюро кангрэсу. Наступны навучальны год У. М. Іваноўскі правёў у Англіі, дзе ў Аксфордскім універсітэце вывучаў англійскую філасофію і наведваў лекцыі Уэба, Сміта, Дайсі і іншых буйных вучоных Вялікабрытаніі.**

**У 1902—1903 гадах У. М. Іваноўскі чытаў лекцыі і вёў практычныя заняткі па гісторыі навук і філасофіі ў Рускай школе грамадскіх навук у Парыжы. Тады ж яму пашчаслівілася сустрэцца з У. І. Леніным і слухаць яго лекцыі па аграрнаму пытанню.**

**...Вярнуўшыся на радзіму, У. М. Іваноўскі працаваў выкладчыкам у Маскоўскім універсітэце, на Вышэйшых жаночых курсах, у Казанскім універсітэце. У 1904 годзе ад Казанскага універсітэта прыняў удзел у ІІ Міжнародным філасофскім кангрэсе (Жэнева), зноў быў перавыбран у бюро кангрэсу, членам якога быў да 1926 года. У 1910 годзе вучоны абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Асацыянізм гнасеалагічны і псіхалагічны» і павінен быў заняць кафедру філасофіі, аднак за ўдзел у студэнцкім рэвалюцыйным руху міністр асветы не толькі пазбавіў яго гэтай магчымасці, але нават забараніў яму чытаць аплачваемыя курсы лекцый. Чалавек, імя якога ўжо добра было вядома не толькі ў навуковых колах Расіі, але і ў еўрапейскіх краінах, застаўся без работы. Да самай Кастрычніцкай рэвалюцыі яму прыйшлося задавальняцца выпадковымі заработкамі, пераязджаць з горада ў горад.**

**У 1913—1920 гадах У. М. Іваноўскі — адзін з арганізатараў, а затым і рэктар Самарскага універсітэта. У 1921 годзе па запрашэнню У. І. Пічэты ён пераязджае на работу ў БДУ. З яго імем звязана гісторыя станаўлення і развіцця універсітэта — з лютага 1922 па сакавік 1924 года ён быў членам праўлення і намеснікам рэктара па акадэмічнай рабоце, старшынёй навуковага савета, членам рэдкалегіі і тэхнічным рэдактарам «Прац БДУ». Вялікай папулярнасцю карысталіся яго лекцыі па логіцы і метадалогіі навукі, гісторыі філасофіі. Дэлегатам ад Беларусі ён прымаў удзел у з'ездах псіхолагаў.**

**Акрамя работы ў БДУ, У. М. Іваноўскі чытаў лекцыі ў тэхнікумах Мінска, на гарадскіх і рэспубліканскіх курсах настаўнікаў, выязджаў з дакладамі ў многія гарады рэспублікі. Ён шырока прапагандаваў сярод насельніцтва Беларусі філасофскія веды. Вялікай папулярнасцю карысталіся яго навуковыя працы.**

**У 1926 годзе У. М. Іваноўскі перанёс цяжкую хваробу, вымушан быў пакінуць працу ў БДУ і пераехаць у Маскву. На працягу 12 год, да самай смерці, ён атрымліваў персанальную пенсію СНК БССР.**

(Біяграфія друкуецца ў скарачэнні).

# РАДОК У НАВУЦЫ

*Аўтары кнігі— студэнты*



АЛЯКСАНДРАЎ Георгій Фёдаравіч нарадзіўся 5 сакавіка 1908 года ў Пецярбургу ў сям'і пуцілаўскага рабочага. Пасля смерці бацькі з 1920 года выхоу[illegible]ся у Барысаглебскім [illegible]дзячым доме Тамбоўскай вобласці. У 1924 годзе паступіў у Тамбоўскую партыйную школу першай ступені, пасля заканчэння якой на працягу года працаваў выхавацелем таго ж дзіцячага дома. У 1926—1928 гадах — слухач Тамбоўскай партыйнай школы другой ступені, тут у 1928 годзе уступіў у бальшавіцкую партыю. З вясны 1928 года працаваў у агітпропе Барысаглебскага акружкома партыі.

Восенню 1930 года Г. Ф. Аляксандраў стаў студэнтам філасофскага факультэта Інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры ў Маскве. Паспяхова закончыўшы яго і праявіўшы здольнасці да навуковай працы, ён быў рэкамендаван у аспірантуру МДУ. У 1935 годзе Г. Ф. Аляксандраў абараніў кандыдацкую дысертацыю, а праз чатыры гады — доктарскую.

Педагагічную дзейнасць пачаў у 1933 годзе, з 1935 года чытаў лекцыі па гісторыі філасофіі ў МДУ, ВПШ і Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б). Прафесар з 1936 года. Узначальваў філасофскія кафедры ў МДУ і іншых навучальных установах краіны. Разам з педагагічнай, навуковай працай Г. Ф. Аляксандраў вёў вялікую грамадскую работу. У 1938 годзе ён выконваў абавязкі загадчыка рэдакцыйна-выдавецкага аддзела Выканкома Камінтэрна, у 1940—1947 гадах быў начальнікам Упраўлення прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б), у 1947 — 1953 гадах працаваў дырэктарам Інстытута філасофіі АН СССР (акадэмік з 1946 года), у 1953—1955 гадах быў міністрам культуры СССР.

У верасні 1955 года па рашэнню ЦК КПСС Г. Ф. Аляксандраў быў накіраван на навуковую работу ў Беларусь. З 1955 па 1961 год ён працаваў загадчыкам сектара дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму Інстытута філасофіі і права АН БССР і адначасова прафесарам кафедры гісторыі філасофіі і логікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, дзе чытаў лекцыі па гісторыі філасофіі, рыхтаваў навуковыя кадры, вёў вялікую навукова-даследчую работу.

Пяру Г. Ф. Аляксандрава належыць звыш 200 работ па гісторыі філасофіі, сацыяльна-палітычных вучэнняў, па тэарэтычных праблемах сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. Адчувальны яго ўклад у стварэнне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі філасофіі для студэнтаў. Ён двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1943, 1947).

Памёр Г. Ф. Аляксандраў 21 ліпеня 1961 года ў Маскве.

## ЧВЭРЦЬ ВЕКА НА ЧАЛЕ КАФЕДРЫ

**СЦЯПАНАЎ Васіль Іванавіч, рускі, нарадзіўся 13 сакавіка 1903 года ў вёсцы Залатое Залатоўскага раёна Саратаўскай вобласці ў сям'і сапожніка. З 11 год стаў дапамагаць бацьку ў рабоце. Толькі Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла перад юнаком дарогу да ведаў.**

**У 1921 годзе В. І. Сцяпанаў закончыў школу другой ступені, актыўна ўключыўся ў камсамольскае жыццё раёна, затым служыў у часцях ЧАН. З 1922 года В. І. Сцяпанаў — курсант аблсаўпартшколы ў г. Энгельсе, а з 1923 па 1926 год працуе выкладчыкам гэтай жа школы. Член партыі з 1924 года. Пасля службы ў Чырвонай Арміі В. І. Сцяпанаў вяртаецца ў родную вёску і аж да 1929 года выкладае ў мясцовай школе, вядзе тут вялікую прапагандысцкую работу. Камуністы вёскі выбіраюць яго сакратаром партячэйкі.**

**З 1929 па 1932 гады В. І. Сцяпанаў — студэнт філасофскага факультэта Акадэміі камуністычнага выхавання імя Н. К. Крупскай, пасля заканчэння якой быў пакінут у аспірантуры. У 1935 годзе В. І. Сцяпанаў абараніў кандыдацкую дысертацыю «Філасофскія погляды М. Г. Чарнышэўскага» і накіраван у Сталінградскі педагагічны інстытут. Тут да 1943 года ён працаваў дацэнтам, загадчыкам кафедры марксізма-ленінізма, дэканам гістарычнага факультэта, намеснікам дырэктара інстытута па навуковай і вучэбнай рабоце, сакратаром партыйнай арганізацыі.**

**У 1943 годзе В. І. Сцяпанаў прызван у армію і пасля заканчэння кароткатэрміновых афіцэрскіх курсаў назначан начальнікам сацыяльна-эканамічнага цыклу Чкалаўскага вучылішча зенітнай артылерыі. Затым працаваў лектарам палітаддзела Першай танкавай арміі І Беларускага фронту і на іншых ваенна-палітычных пасадах.**

**В. І. Сцяпанаў дэмабілізаван з радоў Савецкай Арміі ў 1947 годзе і ў снежні таго ж года выбран на пасаду загадчыка кафедры марксізма-ленінізма Белдзяржуніверсітэта, а з верасня 1948 года — амаль чвэрць века — узначальвае кафедру марксісцка-ленінскай філасофіі.**

**На працягу пяці год (1962—1967) В. І. Сцяпанаў— прарэктар БДУ па навуковай рабоце. У 1960 годзе ён абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Філасофскія і сацыялагічныя погляды В. Р. Бялінскага». Прафесар з 1961 года, у 1967 годзе выбран членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.**

**Васіль Іванавіч Сцяпанаў вядзе вялікую педагагічную, навукова-даследчую і прапагандысцкую работу. Ім апублікавана звыш 60 навуковых прац, падрыхтаваны 33 кандыдаты навук. В. І. Сцяпанаў — член рэдкалегій часопіса «Камуніст Беларусі», грамадска-палітычнай серыі «Весніка БДУ», член вучонага савета універсітэта. На працягу многіх год ён кіруе тэарэтычным філасофскім семінарам навуковых супрацоўнікаў прыродазнаўчых факультэтаў БДУ, выкладае дыялектычны матэрыялізм ва універсітэце марксізма-ленінізма пры Мінскім гаркоме партыі.**

**За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і заслугі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у развіцці навукі В. І. Сцяпанаў узнагароджан ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.**

## ВУЧОНЫ-ПРАПАГАНДЫСТ

САМУСКЕВІЧ Анатоль Уладзіміравіч, беларус, нарадзіўся 24 красавіка 1931 года ў г. Чэрвені Мінскай вобласці. У 1939 годзе пайшоў у другі клас сярэдняй школы. У перыяд Айчыннай вайны вучобу прадоўжыў у Кастраме, куды быў эвакуіраван. У 1945 годзе уступіў у камсамол, у тым жа годзе пераехаў у Беларусь.

Пасля заканчэння Горацкай сярэдняй школы (Магілёўская вобласць) у 1948 годзе А. У. Самускевіч паступіў на філасофскае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, атрымаў дыплом выдатніка. З 1953 года — аспірант кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, а ў 1958 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дыялектыка перапыннага і беспераПыннага і некаторыя праблемы сучаснага атамізму».

А. У. Самускевіч вядзе выкладчыцкую работу з 1953 года, спачатку ў вячэрнім універсітэце марксізма-ленінізма, а з 1955 года — у БДУ. З 1966 года — дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі. Распрацаваў і чытае лекцыйныя курсы па дыялектычнаму матэрыялізму на фізічным і матэматычным факультэтах, на аддзяленнях філасофіі завочнага факультэта, курс па філасофскіх пытаннях прыродазнаўства — для студэнтаў-філосафаў і студэнтаў фізфака, а таксама расшыраныя спецкурс і спецсемінар па філасофскіх праблемах прыродазнаўства на філасофскім аддзяленні. Ён з'яўляецца прадстаўніком секцыі філасофіі навукова-метадычнага савета аддзела выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, старшынёй секцыі дыялектычнага матэрыялізму кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ.

Дацэнт А. У. Самускевіч працягвае весці заняткі ў вячэрнім універсітэце марксізма-ленінізма. Ён актыўны прапагандыст філасофскіх ведаў у Беларусі, удзельнік многіх навукова-тэарэтычных і метадычных канферэнцый, якія праводзяцца гарадскімі і сельскімі партыйнымі арганізацыямі. На працягу больш дзесяці год А. У. Самускевіч кіруе тэарэтычным семінарам па філасофіі выкладчыкаў фізічнага факультэта універсітэта, а таксама з'яўляецца членам метадычнага савета па філасофіі Дома палітычнай асветы абкома і гаркома партыі, няштатным лектарам АК і ГК КПБ, ЦК ЛКСМБ.

А. У. Самускевіч вядзе навуковыя даследаванні галоўным чынам па філасофскіх праблемах прыродазнаўства. Акрамя навуковых прац па гэтых пытаннях, ім апублікаван шэраг артыкулаў у перыядычным друку.

## ПА КАМСАМОЛЬСКАЙ ПУЦЁЎЦЫ

**МАЛЕВІЧ Сігізмунд Адамавіч нарадзіўся 5 ліпеня 1936 года ў горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочага. Па нацыянальнасці беларус, член КПСС з 1960 года.**

**З 1954 па 1959 гады — студэнт гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта С. А. Малевіч быў накіравак на камсамольскую работу: 1959—1961 гады — інструктар Мінскага абкома камсамола, першы сакратар Бярэзінскага РК ЛКСМБ, з 1961 па 1964 год — інструктар ЦК ЛКСМБ, намеснік загадчыка аддзела ЦК камсамола Беларусі.**

**У 1964 годзе па камсамольскай рэкамендацыі С. А. Малевіч паступіў у аспірантуру БДУ і займаўся пры кафедры гісторыі філасофіі і логікі. Пасля заканчэння аспірантуры (1967) чытае на гуманітарных факультэтах і філасофскім аддзяленні агульны курс гісторыі філасофіі і лекцыі па гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі.**

**Кандыдацкую дысертацыю на тэму «Сацыялагічныя погляды Людвіга Кржывіцкага» С. А. Малевіч абараніў у 1968 годзе. Ім напісана сем навуковых прац па гісторыі філасофіі, праблемах выхавання моладзі і гісторыі прагрэсіўнай думкі ў Польшчы.**

**У 1970 годзе вучоным саветам універсітэта С. А. Малевіч выбран на пасаду дацэнта.**

## ЭСТАФЕТА

## Ў НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

*З 1921 года добрай традыцыяй у нашым універсітэце стаў саюз кадраў сталых і маладых вучоных. Саюз пакаленняў прыносіць плённыя вынікі. Моладзь працягвае справы старэйшых выкладчыкаў, апраўдвае іх давер'е.*

*НА ЗДЫМКАХ: кандыдат філасофскіх навук дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Ю. А. ГУСЕЎ, яго калега па кафедры кандыдат філасофскіх навук М. І. ЖУКАЎ, дацэнт кафедры гісторыі філасофіі і логікі кандыдат філасофскіх навук М. В. РОЖЫН, загадчык кафедры філасофіі Мінскай дзяржаўнай кансерваторыі кандыдат філасофскіх навук А. П. САНКОЎ (ён закончыў аспірантуру БДУ і працаваў тут), загадчык сектара сацыялагічных даследаванняў Інстытута філасофіі і права АН БССР доктар філасофскіх навук Г. П. ДАВІДЗЮК (на філасофскім аддзяленні БДУ выкладае сацыялогію).*







